**Литература и источники**

1. Князева, Е. Н. Трансдисциплинарные стратегии исследований / Е. Н. Князева // Вестник ТГПУ. – 2011. – № 10. – С. 193–201.

2. Трансдисциплинарность в философии и науке: подходы, проблемы, перспективы. – М.: Навигатор, 2015.

3. Хартия трансдисциплинарности. Статья 6 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://anoitt.ru/ index4.php.

4. Афанасьев, А. И. Трансдисциплинарность и профессионализм / А. И. Афанасьев, И. Л. Василенко // Докса. Збірник наукових праць з філософії та філології. – 2016. – Вип. 2 (26). – С. 8–18.

## ДЫЯЛЕКТЫКА БЕСПЕРАПЫННАГА І ДЫСКРЭТНАГА Ў СВЯТЛЕ ТРАНСДЫСЦЫПЛІНАРНАГА ПАДЫХОДУ

*А. І. Бабко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема суадносін бесперапыннага і дыскрэтнага аспектаў рэчаіснасці мае выразна выяўлены трансдысцыплінарны характар. Сапраўды, зрабіўшыся тэмай вострых філасофскіх дыскусій ужо ў эпоху Антычнасці, яна не знікала больш з поля зроку філосафаў. Разам з тым, выдатнае месца належыць ёй і ў сферы навукі, асабліва ў абсягу квантавай фізікі. Філасофскі і навуковы разгляд адпаведнай тэматыкі зусім не заставаліся абыякавымі адзін да аднаго. У іх узаемадзеянні выявіліся грунтоўныя аспекты ўзаемадачыненняў навукі і філасофіі, надзвычай важныя для рэалізацыі трансдысцыплінарных даследчых стратэгій.

Найвялікшыя поспехі ў філасофскім вырашэнні праблемы суадносін бесперапыннага і дыскрэтнага былі дасягнуты ў абсягу дыялектычнай традыцыі. Па-першае, у гэтым абсягу яна была належным чынам – гэта значыць з правакацыйнай яснасцю і вастрынёй – сфармулявана. Апарэйтычная дыялектыка элеатаў дала магутны імпульс яе аналізу і фактычна акрэсліла найбольш эфектыўныя шляхі яе вырашэння: у парадоксах Зянона фіксуецца той момант, што аднабаковая артыкуляцыя пэўнага з гэтых аспектаў цягне за сабой грунтоўныя супярэчнасці. У Новы час адпаведную ролю ў разгортванні філасофскай думкі выканала антынамічная дыялектыка Канта. Па-другое, у спекулятыўна-дыялектычнай канцэпцыі Гегеля, якая грунтуецца на прынцыпе тоеснасці супрацьлеглых пачаткаў, цалкам у згодзе з гэтым прынцыпам падкрэсліваецца іх непадзельнае адзінства.

Гегелеўскі падыход падаецца надзвычай адэкватным лёсу гэтых катэгорый, што напаткаў іх у сферы навуковага пошуку. Гэты пошук схіляўся найперш да артыкуляцыі пэўнага са згаданых аспектаў (класічная механіка грунтавалася на прынцыпе дыскрэтнасці, тэорыя электрамагнетызму – на прынцыпе бесперапыннасці). Логіка разгортвання даследаванняў у рамках квантава-механічнай парадыгмы прыводзіць іх да сінтэтычнай мадэлі спасціжэння ўзаемаадносін згаданых момантаў. Ужо

першы (і таму досыць нясмелы) крок, зроблены ў гэтым кірунку, меў менавіта сінтэтычны характар: феномен выпраменьвання, які традыцыйна разглядаўся як увасабленне выключна бесперапыннага пачатку, мусіў быць апісаны таксама на аснове прынцыпу дыскрэтнасці. Пазней квантава-хвалевы дуалізм, уласцівы згаданаму феномену, быў абагульнены і распаўсюджаны на матэрыю, на аб'екты мікрасвету.

У гэтым пункце, аднак, запачаткоўваецца новы, надзвычай цікавы і надзвычай рэлевантны для далейшага разгортвання навуковых даследаванняў у дадзенай сферы аспект праблемы. Ён звязаны з вызначэннем ролі і месца абодвух момантаў у рамках іх адзінства. І Луі дэ Бройль, якому належыць заслуга згаданага абагульнення, і Эрвін Шродзінгер, які распрацаваў удалую матэматычную версію квантавай механікі, інспіраваную ідэнтычнымі даследчымі інтэнцыямі (абагульніць класічную механіку на аснове хвалевага прынцыпу аналагічна таму, як геаметрычная оптыка была абагульнена хвалевай (фізічнай) оптыкай), аддавалі выразную перавагу прынцыпу бесперапыннасці. У адпаведнасці з дадзенай інтэрпрэтацыяй карпускулярны (дыскрэтны) аспект фізічнай рэальнасці вынікае з яе хвалевага аспекта. На эмпірычным ўзроўні, аднак, дамінуе момант дыскрэтнасці: працэс вымярэння мусіць мець завершаны характар [1, с. 19–21]. Прынцып бесперапыннасці павінен быць звязаны, значыцца, з тэарэтычным пазнаннем, дзе ён найбольш яскрава выяўляецца ў матэматычных функцыянальных сувязях [1, с. 21].

Нільс Бор і Вернер Гейзенберг, аднак, распрацоўвалі альтэрнатыўны падыход, цэнтральнае месца ў якім адводзілася ідэі дыскрэтнасці. Аднак, хоць іх праект кідаў больш радыкальны выклік класічным уяўленням, чым хвалевы варыянт квантавай механікі, прадказанні адносна вынікаў эмпірычных даследаванняў, зробленыя на яго аснове, супадалі з тымі, якія рабіліся на грунце альтэрнатыўнага падыходу [1, с. 19].

Надзвычай важна, што фізікі, якія згадваліся вышэй, імкнуліся асэнсаваць філасофскія імплікацыі іх навуковых пошукаў. Да гэтага тыпу навукоўцаў, якія здолелі ўзняцца да філасофскай рэфлексіі, належыць і Карл Фрыдрых Вайцзэкер, які надаваў праблеме суадносін бесперапыннага і дыскрэтнага вялікае значэнне. Ён надзвычай высока ацэньваў пазнавальны патэнцыял квантавай фізікі, указваючы, што ў адрозненне ад класічных тэорый, якія «апісваюць розныя класы прадметаў (целы, сілавыя палі, прасторавыя структуры), сфармуляваная ў дастаткова абстрактнай форме, квантавая тэорыя з'яўляецца ўніверсальнай тэорыяй для ўсіх класаў прадметаў» [2, с. 128] (тут і далей пераклад мой. – *А. Б.*). Яе ўніверсальны характар абумоўлены тым, што адпаведная (халістычная) яе інтэрпрэтацыя грунтуецца на ідэі ўніверсальнай сувязі, якая мае, на думку навукоўца, аднак, некаўзальны характар [2, с. 134].

Мяркуючы па ўсім, К. Ф. фон Вайцзэкер разглядае згаданую сувязь як усёабдымны кантынуум, як увасабленне бесперапыннага першапачатку рэчаіснасці. Увогуле ў формуле «бесперапынная існасць – дыскрэтная рэальнасць» перадаецца грунтоўны аспект яго поглядаў, і гэта выразна выяўляецца пры вырашэнні ім надзвычай важных пытанняў. Часам згаданай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формуле надаецца роля падставы для іх магчымага вырашэння, як у выпадку здзейсненага даследчыкам аналізу суадносін душы і цела, калі ён піша, што ўсходнія мадэлі згаданых суадносін ці платонаўскае ўяўленне пра іх маглі б разглядацца як спалучальныя з халістычнай інтэпрэтацыяй квантавай тэорыі, згодна з якой у такім выпадку цела фігуравала б як прасторава-абмежаваны пачатак чалавека, а душа – як увасабленне магчымага, як кантынуум [2, с. 218].

У дадзенай сувязі паўстае пытанне: чым растлумачыць гэтыя погляды навукоўца, сфарміраванага найперш пад уплывам Н. Бора і В. Гейзенберга? Апошнія, як было падкрэслена вышэй, аддавалі перавагу прынцыпу дыскрэтнасці. Ці не падштурхнулі яго заняць менавіта такую пазіцыю ягоныя філасофскія і рэлігійныя пошукі? Ці не ў гэтых пошуках карэніцца яго ўяўленне, згодна з якім у рамках халістычнай інтэрпрэтацыі квантавай тэорыі кожны з нас мусіць фігураваць як частачка цэлага [2, с. 216]? Ці не пад іх уплывам ён лічыць цалкам правамерным дапусціць, што мы з’яўляемся элементамі больш шырокай духоўнай рэчаіснасці, якая застаецца ў звычайных умовах незаўважанай [2, с. 146]?

Халістычная інтэрпрэтацыя квантавай фізікі, як цалкам справядліва лічыць К. Ф. Вайцзэкер, хоць і не замяняе філасофію, тым не менш падыходзіць да яе надзвычай блізка: «Калі строгае сённяшняе прыродазнаўства вядзе да халізму, дык яно, як падаецца, прасоўваецца тым самым да непасрэднага суседства з метафізікай» [2, с. 220]. Пры гэтым гучыць аргумент, аналагічны таму, што выкрыстоўваецца Г.-Г. Гадамерам, калі ён абгрунтоўвае партыкулярны ў канчатковым выніку характар фізічнай карціны свету: па-за межамі здзейсненага фізікам апісання рэчаіснасці знаходзіцца сам фізік, які робіць адпаведныя разлікі [2, с. 135; 3, с. 456].

Відавочна, што згаданая блізкасць дазваляе істотна інтэнсіфікаваць узаемадзеянне навукі і філасофіі і належыць да найважнейшых умоў, што вызначаюць магчымасць трансдысцыплінарных даследаванняў. Навука ўвогуле і фізіка ў прыватнасці выступае як крыніца надзвычай цікавых праблем для філасофскай думкі, а філасофская думка здольная выступіць для навуковага пошуку ў якасці своеасаблівай творчай лабараторыі, у якой распрацоўваюцца стратэгічна важныя для яго ідэі. Гэта выразна выявілася на прыкладзе разгледжанай вышэй праблемы. Сама логіка яе асэнсавання ў філасофіі і навуцы (фізіцы) падштурхоўвала і падштурхоўвае іх адна да адной, што цягне за сабой у найвышэйшай ступені станоўчы вынік – комплекснае, усебаковае яе вывучэнне.

**Літаратура і крыніцы**

1. Schrödinger, E. Was ist ein Naturgesetz? Beiträge zum naturwissenschaftlichen Weltbild / E. Schrödinger. – München, Wien: R. Oldenbourg, 1962.

2. Weizsäcker, C. F. v. Der Mensch in seiner Geschichte / C. F. von Weizsäcker. – München, Wien: Carl Hanser Verlag, 1991.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Gadamer, H-.G. Hermeneutik: Wahrheit und Methode. – 1. Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik / H.-G. Gadamer. – Gesammelte Werke. – Bd. 1. – Tübingen: J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990.

## ФЕНОМЕН КУЛЬТУРНЫХ ГРАНИЦ И ПЕРСПЕКТИВЫ АКСИОЛОГИЧЕСКОГО ДИАЛОГА

*В. А. Белокрылова*

Цифровая революция, проникновение интернет-коммуникаций во все сферы общественной жизни способствует интенсификации межкультурных контактов. Вместе с тем циркуляция информации о культурах в глобальном информационном пространстве – это еще не «разговор», а тем более не признание этнического и культурного многообразия. Можно сказать, что инфраструктурные, технические факторы сегодня опережают формирование способностей к межкультурному диалогу, равноправию и взаимному принятию, признанию самостоятельной ценности уникального культурного багажа, который может радикально отличаться от привычного.

Актуальной и до сих пор малоэксплицируемой в русскоязычном сегменте проблемой является механизмы достижения ценностного консенсуса в ходе межкультурного диалога. Насколько аксиологические доминанты культуры вообще корректно делать предметом оценивания извне, фактически с позиций собственной культурной традиции? Средоточием проблемы ценностного измерения межкультурного диалога является сопряжение аксиологической доктрины общечеловеческих гуманистических норм и форм (канонов) локального культурного континуума.

Концепция межкультурного диалога исторически пришла на смену парадигмам ассимиляции и мультикультурализма. «Межкультурный диалог понимается как открытый и уважительный обмен мнениями на основе взаимопонимания и уважения между отдельными людьми, а также группами людей различной этнической, культурной и языковой принадлежности, имеющие разные исторические корни» [1, с. 10]. Именно аксиологический уровень межкультурного взаимодействия является одним из наиболее проблемных в установлении отношений подлинного, а не номинального диалогизма равноправных субъектов.

Методология реконструкции ценностного измерения межкультурного диалога требует концептуализации двух противоположных тенденций в дискурсивно-смысловом пространстве встречи культур: аксиологической идентичности («закрытости») и коммуникативной открытости. С одной стороны, «поле диалога –это среда, в которой означающее, уже наполненное множеством значений и коннотаций, утрачивает некие наличные значения и приобретает новые» [2, с. 11]. Коммуникативная открытость выступает и предпосылкой, и результатом диалога культур в диапазоне от соприкосновения вплоть до взаимной конверсии смыслов и ценностей. Однако означает ли это, что взаимная открытость культур обязательно ведет

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ